# Мы пілі з ім чай, але ен ні разу не усміхнууся...



Летам 84-га напярэдадні святкавання 40-х угодак вызвалення Беларусі, ветэраны знемагалі ў здагадках: хто «пожалует» з Масквы? Злыя языкі разносілі, што Мазураву, паколькі «его ушли», ці то не рэкамендуецца з'яўляцца на людзях, ці то сам ён, незаслужана пакрыўджаны адстаўкай, адмаўляецца ад удзелу ў святах. І магчыма таму прыезд машэраўскага папярэдніка стаўся амаль сенсацыйным. Вестка разнеслася імгненна. Дагэтуль невядома, ці па крамлёўскаму даручэнню Кірыла Трафімавіч апынуўся на Бацькаўшчыне, ці па ўласнай волі, будучы ўжо персанальным, вольным...

Памятаю, ён выйшаў з цягніка на мінскі перон, а побач крочыў тагачасны лідэр КПБ тав. Слюнькоў. Кінулася ў вочы — ішлі яны без радасці, нават хмурыя, не звяртаючы ні на кога ўвагі. Нібы штодня рабілі такія прагулкі. Але што ў тым дзіўнага. Нідзе і нколі народ не бачыў кіраўнікоў сваёй неабдымнай дзяржавы і самай роднай партыі іншымі, як толькі са сцятымі сківаіцамі і каменнымі позіркамі. Але справа не ў гэтым. Упершыню ў жыцці мне давялося гэтак блізка бачыць і здымаць легендарную і таямнічую асобу. Не памятаю, праз якія вакзальныя дзіркі я мінуў міліцэйскі кардон, але добры дзесятак тады яшчэ аматарскіх кадраў адлюстравалася на стужцы. Імпэт падагравала тое, што Мазураў быў у апале, забаронены для беларусаў. Ён быў вязнем сістэмы. Можа, якраз гэты крамлёўскі палон не дазволіў Мазураву прайсці 3-га ліпеня ў святочнай калоне па галоўнаму мінскаму праспекту. Упэўнены, што многія людзі стаялі абапал праспекта дзеля таго, каб убачыць былога сакратара.



З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы